# СНЕЖАНЬ – ПАРА ТРАДЫЦЫЙНЫХ СУСТРЭЧ

**6 снежня ў Гудзевіцкім літаратурна-краязнаўчым музеі адбылася сустрэча з дэлегацыяй Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі.**

Правядзенне такіх сустрэч стала ў музеі добрай традыцыяй. У гэты раз перад прысутнымі выступілі Людміла Кебіч, Людміла Шаўчэнка, Андрэй Татур, Ірына Салата і Мікалай Іваноўскі. Зноў у выкананні аўтараў гучалі цудоўныя творы, літаратурныя і песенныя. Госці расказвалі аб сваёй творчасці, знаёмілі са зборнікамі ўласных твораў. У якасці слухачоў на сустрэчы былі мясцовыя жыхары, аматары мастацтва.

**ДУК «Гудзевіцкі літаратурна-краязнаўчы музей»**

**На фота:** эпізоды сустрэчы з дэлегацыяй Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі ў Гудзевіцкім літаратурна-краязнаўчым музеі. Мастоўскі раён, Гродзенская вобласць. 6 снежня 2023 года.













Гудзевіцкі
літаратурна
краязнаўчы музей